дасягненні асобных бібліятэк, бібліяграфаў, якія стварылі сістэмы дапаможнікаў. Разам з тым неабходна азнаёміць студэнтаў і з лепшымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі і базамі дадзеных замежных краін і міжнародных арганізацый. Паказаць пошуковыя магчымасці дапаможнікаў, ацаніць іх з пункту гледжання забеспячэння ІП спецыялістаў Беларусі.

Думаецца, што прапанаваная структура падручніка адлюстроўвае нацыянальныя галіновыя бібліяграфічныя рэсурсы і адпавядае задачам прафесійнай падрыхтоўкі кадраў.

## АРГАНІЗАЦЫЯ ДАСУГА ЛЮДЗЕЙ ПАЖЫЛОГА УЗРОСТУ ЗА МЯЖОЙ

І.М.Фамчылёна

Старэнне насельніцтва, якое назіраецца ва ўсіх развітых краінах свету, прыносіць з сабою шматлікія праблемы. Яны датычацца не толькі сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя пажылых людзей. У Японіі, скажам, склалася становішча, якое сур'ёзна клапоціць і урад, і ўсе грамадства. Гаворка ідзе пра тое, што удзельная вага людзей пажылога ўзросту сярод іншых груп насельніцтва наблізілася да 20%. І цяпер у весь рост паўстае праблема захавання і падтрымання на належным узроўні сацыяльнага і грамадскага статусу такіх людзей. Менавіта таму вялізнае значэнне надаецца арганізацыі іх дасуга максімальнаму уключанню іх у культурныя працэсы.

У розных краінах, у залежнасці ад ступені іх сацыяльна-эканамічнага развіцця, названыя праблемы вырашаюцца па-рознаму. Зразумела, справы больш паспяхова ідуць там, дзе людзі пажылыя маюць разнастаковую грамадскую і дзяржаўную падтрымку. Напрыклад, Амерыканская асацыяцыя пенсіянераў, якая па розных дадзеных налічвае ад 9 да 15 мільёнаў чалавек, уяўляе сабой значную грамадскую сілу, якая можа уплываць і на урад, і на грамадства ў цэлым. Пастаянныя карэкціраванні ў розных краінах, акрамя клопату аб сацыяльным і медыцынскім забеспячэнні, [illegible] у [illegible] арганізацыі іх вольнага часу, пачынаючы з [illegible]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыі і прапануюць самыя розныя варыянты правядзення дасуга на самыя розныя густы і патрэбы. Узнікаюць нярэдка і куды меншыя па маштабах, але таксама вельмі эфектыўныя групы самадапамогі ў краінах Заходняй Еўропы. Старыя людзі не толькі чакаюць дапамогі ад грамадства, але і самі актыўна удзельнічаюць у рабоце такіх груп, значную частку дзейнасці якіх прысвячаюць арганізацыі дасуга. Той жа мэты дасягаюць рэгулярныя выставы, святы, мерапрыемствы, якія прадугледжваюць актыўны удзел людзей пажылога ўзросту. З 60-х гадоў, напрыклад, у Англіі працуюць шматфункцыянальныя цэнтры, якія адыгрываюць ролю ў сацыяльна-культурным забеспячэнні жыцця пенсіянераў. Спецыялісты такіх цэнтраў распрацоўваюць і дзяржаўныя праграмы у тым жа напрамку. Заслугоўваюць увагі шматлікія і паспяховыя накірункі прыцягнення пажылых людзей у сістэмы адукацыі. Таму спрыяе і распрацаваная канцэпцыя бесперапыннай адукацыі альбо адукацыі на працягу ўсяго жыцця. Такая канцэпцыя не толькі мае перад сабой яскрава вызначаную прагматычную мэту, але прызнае навучанне ў пажылым узросце сацыяльназначнай дзейнасцю. Многія Універсітэты ЗША улічваюць у сваіх праграмах патрэбы старых людзей у пашырэнні ведаў, прыцягваюць іх да навукова-даследчых работ. У Швецыі дзяржавай фінансуюцца спецыяльныя адукацыйныя тэле-радыепраграмы для пенсіянераў. Для іх жа ва Францыі створаны так званыя "Універсітэты трэцяга ўзросту". Адна з не камерцыйных, напрыклад, прапаноўвае пажылым людзям заняткі на курсах, якія арганізаваны ў некалькіх сотнях інстытутаў і універсітэтах розных краін свету.

Яшчэ адзін бок арганізаванай работы з пенсіянерамі--развіцце спартыўна-аздараўленчай дзейнасці. У ФРГ гэтым ушчыльную займаюцца, напрыклад, Нямецкі Чырвоны Крыж і саюз "Карытас", шматлікія дабрачынныя арганізацыі. Адзін з дэвізаў іх з'ўляецца такі: "Рух да самай старасці". З улікам індывідуальных патрэб: магчымасцей пенсіянераў ім прапануецца шырокі спектр заняткаў - ад веласіпедных прагулак да дыферынцыраванай гімнастыкі.

Зразумела, многія віды дасугавай дзейнасці выкарыстоўваюцца у комплексе. У ЗША, у штаце Каліфорнія, напрыклад, працуе "Буэна - парк", дзе ў спецыяльным цэнтры пенсіянерам прапануюцца самыя разнастайныя віды пасіўнага і актыўнага адпачынку: заняткі фізкультурай, маляваннем, па вырабу керамікі, бібліятэкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ншат іншага.

Фінансаванне дзейнасці шматлікіх арганізацый, якія займаюцца дасугам пенсіянераў, ідзе з розных крыніц – царкоўных, дабрачынных, дзяржаўных. Выдаткі, зразумела, вялікія, бо стварэнне і падтрыманне ў належным парадку матэрыяльнай базы патрабуе значных сродкаў. Усведамленне неабходнасці такой дзейнасці ў розных сферах грамадства дапамагае знайсці разуменне энтузіястам гэтай справы, спецыялістам, якіх нямала працуе ў галінах, звязаных з жыццём пажылых людзей. Вопыт іншых дзяржаў у падтрымцы высокароднай работы ў галіне дасуга пенсіянераў варты уважлівага вывучэння і пераймання ўсяго лепшага.

## ПАХАВАЛЬНА-ПАМІНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ

Я.П.Ліпень

Стан сучасных пахавальных абрадаў у рэспубліцы сведчыць аб тым, што цяпер у беларускім пахавальным абрадзе назіраецца пераплячэнне старых народных звычаяў, якія склаліся ў даўнія часы, рэлігійных і новых. Паступовыя змены, адмiранне некаторых традыцыйных абрадаў і звычаяў звязана са зменай эканамічных фармацый, светапогляду насельніцтва.

З усіх сямейных абрадаў беларускага народа пахавальна-памінальная абраднасць менш за ўсе панесла змяненні, у ей у большай ступені, чым у радзінных і вясельных абрадах захаваліся традыцыйныя элементы. Як паказалі дадзеныя сацыялагічнага даследвання, праведзеннага аўтарам, большасць пахаванняў праводзіцца па абраду, дзе старыя звычаі пераплятаюцца з новымі, узнікшымі у савецкі час. Пахавальная абраднасць складаецца з трох паслядоўных этапаў: перадпахавальныя дзеянні, звязаныя з фактам смерці і падрыхтоўкай нябожчыка да пахавання; пахаванне; пасляпахавальныя – памінальныя абрады.

У перадпахавальным этапе у наяўнасці такія традыцыйныя элементы і дэталі як закрыванне вачэй нябожчыку, абмыванне, адзяванне (пажадана, ва ўсе новае), апавяшчанне сваякоў, няспанне каля нябожчыка. Захаваліся, асабліва у сельскай мясцовасці, галашэнні. Па звычаю, у памяшканні, дзе устаноўлена труна, люс-